**МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

вул.Мяснікова,39, 220048, г.Мінск
тэл. 222 65 47, факс 222 46 27
сайт: www.minzdrav.gov.by
e-mail : mzrb@belcmt.by,
«ПАШТАР»: 7000861@mail.gov.by
р/р; BY89AKBB36049000000100000000
у ААТ « ААБ «Беларусбанк», БІК: AKBB BY 2X

**МИНИСТЕРСТВО ЗДРАВООХРАНЕНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

ул.Мясникова,39, 220048, г.Минск
тел. 222 65 47, факс 222 46 27
сайт: www.minzdrav.gov.by
e-mail : mzrb@belcmt.by,
«ПАШТАР»: 7000861@mail.gov.by
р/р: BY89AKBB36049000000100000000
в ОАО « АСБ «Беларусбанк», БИК: AKBB BY 2X

11.05.2020 № 4-5-6/3-4042

На № ______________________

(для інфармавання іншых заяўнікаў)

Аб разгледжанні звароту

Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь (далей – Міністэрства) разгледзела Ваш электронны зварот і паведамляе наступнае.

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 красавіка 2020 г. № 131 «О материальном стимулировании работников здравоохранения» прадугледжвае ўстанаўленне дадатковай штомесячнай надбаўкі за работу ва ўмовах, звязаных з інфекцыйнымі захворваннямі. У прыватнасці, размова ідзе аб работніках устаноў сістэмы аховы здароўя, якія аказваюць медыцынскую дапамогу пацыентам з інфекцыямі, а таксама тых, хто працуе ва ўмовах, звязаных з інфекцыямі.

Беларускім прафесійным саюзам работнікаў аховы здароўя зацверджана Палажэнне аб Фондзе падтрымкі арганізацый аховы здароўя, якія прымаюць удзел у аказанні медыцынскай дапамогі пацыентам з захворваннямі COVID-19.

Згодна з названым Палажэннем матэрыяльная дапамога аказваецца ў выпадках прычынення шкоды жыццю альбо здароўю работніка, якія наступілі ў выніку выканання працоўных абавязкаў, пры выяўленні захворвання, якое выклікана каранавірусам COVID-19.

Медыцынскія работнікі таксама маюць магчымасць самастойна заключыць дагавор добраахвотнага страхавання ад небяспечных захворванняў.

У адпаведнасці з адзначаным у Міністэрства адсутнічаюць падставы для заключэння дагавора калектыўнага страхавання работнікаў аховы здароўя.

Адказ на зварот можа быць абскарджаны ў парадку, вызначаным артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 г. № 300-З «Об обращениях граждан и юридических лиц».

Намеснік Міністра Е.Л.Богдан

Бабчанок
2004690